А. Ф. Рогалеў

СЦЕЖКІ Ў ДАЎНІНУ

Геаграфічныя назвы Беларускага Палесся

МІНСК "ПОЛЫМЯ" 1992

АД АЎТАРА

Цікавасць да гісторыі Радзімы, свайго народа, роднага горада, роднай вёскі ўласціва чалавеку па самой яго сутнасці: кожны з нас, разумее ён гэта ці не, вырастае на спадчыне, у якой сканцэнтраваны векавы вопыт, светапогляд і духоўнае багацце народа.

Але ці заўсёды правільна мы разумеем гісторыю? Ці ўмеем адрозніваць у ёй галоўнае ад другараднага? У час маіх паездак па Палессі, ды і ў іншых сітуацыях мне нярэдка даводзілася чуць, што ў многіх з нашых малых палескіх гарадоў і вёсак няма багатай і выразнай гісторыі. Той, хто прытрымліваецца такой думкі, за ўзор сапраўднага гістарычнага месца звычайна прымае шэры колер сярэдневяковых пабудоў, шпілі гатычных сабораў, вузкія вулачкі-тунелі, базарную плошчу з натоўпамі турыстаў... Бясспрэчна, усё гэта робіць вялікае ўражанне. Аднак наўрад хто можа не пагадзіцца з тым, што гісторыя цікавая не толькі знешнімі прывабнымі атрыбутамі, а перш за усё сваім зместам, сваёй сутнасцю, захаванасцю ў чалавечай памяці. І ў гэтым сэнсе няма гісторыі беднай ці багатай, яна — усюды свая, непаўторная. Дзе б ні жыў чалавек, гісторыя — побач з ім. Трэба толькі прыгледзецца, пашукаць, знайсці і абавязкова захаваць.

Праўда, калі няма ніякіх фактаў, летапісных звестак ці іншых архіўных матэрыялаў, паведамленняў падарожнікаў мінулага, народных легенд і паданняў, гісторыя маўчыць, спіць і разбудзіць яе вельмі цяжка. А калі такія факты і паведамленні ёсць, здаецца няма нічога больш цікавага, чым звязаць іх у адпаведны лагічны ланцужок, знайсці нехапаючыя звенні. У гэтай кнізе чытач сустрэнецца з гісторыяй асобных гарадоў і вёсак Палесся. Нас цікавяць, перш за ўсё, вытокі адпаведных населеных пунктаў, іх пачатковыя старонкі, менавіта тыя далёкія гістарычныя падзеі, ледзь адчувальны водгук

якіх вельмі слаба чуваць ў калейдаскопе стагоддзяў, бо яны (гэтыя падзеі) недастаткова, фрагментарна адлюстраваны ў дакументах і легендах.

Магчыма, сёй-той і палічыць такую накіраванасць пошуку трохі дзіўнай і не вартай увагі. Але не трэба спяшацца, лічыць такі падыход да праблемы рызыкоўным ці абмяжоўвацца заўвагай, што падобнае падарожжа ў мінулае магчыма толькі ў фантастычных летуценнях або ў мастацкім творы. Калі толькі спасылацца на недахоп фактаў і па гэтай прычыне адмаўляцца ад глыбокага экскурсу ў мінулае, мы так ніколі і не даведаемся аб поўнай драматызму старажытнай беларускай гісторыі. Больш таго, мы можам страціць нават тое, што маем зараз.

Жывая гісторыя менавіта тая, што была на самай справе, а не нарадзілася за пісьмовым сталом, заўсёды абавязкова фіксуецца ў адпаведнай мясцовасці. Праявы яе могуць быць самымі разнастайнымі і нечаканымі. У гісторыі, напрыклад, ёсць свая "мова". Гэта — "мова Зямлі", або геаграфічныя назвы, тапонімы (ад грэчаскіх слоў topos — "месца" і onoma/onyma — "імя, назва"). Здараецца так, што нават за адным толькі словам — назвай адпаведнага месца — стаяць надзвычай захапляючыя гістарычныя падзеі. Яны толькі да часу схаваны ад вачэй, як быццам бы тыя рэшткі старажытнага жытла, знайсці якія заўсёды марыць археолаг. Менавіта тапонімы часам даносяць да нас такія звесткі, якія не заўсёды дадуць самыя лепшыя археалагічныя знаходкі. Справа ў тым, што геаграфічныя імёны, асабліва старажытныя, уяўляюць сабой сабраны ў адно слова, зашыфраваны ў мінуўшчыне "тэкст". У гэтым тэксце ёсць тры роды інфармацыі. Першая — *уласна лінгвістычная,* якая дазваляе зразумець моўную прыналежнасць назвы і яе будову. Другая інфармацыя — гэта інфармацыя *энцыклапедычная,* якая захоўвае падрабязнасці нараджэння слова, расказвае аб гістарычных і геаграфічных умовах яго першапачатковага існавання. Інфармацыя трэцяга роду — *сітуатыўная* — апавядае пра адносіны тых, хто даваў імя, да аб'екта, яго назвы. Яна дапамагае даследчыку ўзнавіць сітуацыю, у якой носьбіты пэўнай мовы выбіралі слова для найменя адпаведнай мясцовасці ці аб'екта на ёй.

Геаграфічная назва — гэта не толькі адрасны знак, з дапамогай якога мы адрозніваем адзін аб'ект ад другога, дакладна ўказваем іх месцазнаходжанне. Адрасная функцыя тапонімаў самая першая, спрадвечная, але не адзіная. Кожнае геаграфічнае імя валодае немалым пазнавальным патэнцыялам, нясе вялікі зарад культурнага і ідэалагічнага ўздзеяння, выхоўвае любоў і пашану да роднага краю,

яго мінулага і сучаснага. Назвы — гэта неад'емная частка нашай спадчыны, своеасаблівы сімвал, у якім спалучаюцца гістарычныя здабыткі і светапогляд народа, гэта той таямнічы запіс, які апавядае нам пра мінулыя падзеі і здарэнні, яны — такі ж помнік нашай гісторыі, як і высечаныя з граніту манументы і абеліскі. Нездарма першыя айчынныя тапанімісты яшчэ ў XIX ст. называлі геаграфічныя імёны "мовай Зямлі". Гэтае метафарычнае абазначэнне ўпершыню выкарыстаў выдатны вучоны М. І. Надзеждзін, які ў адной са сваіх прац заўважыў: "Тапаніміка — гэта мова Зямлі, а Зямля ёсць кніга, дзе гісторыя чалавечая запісваецца ў геаграфічнай наменклатуры".

З лінгвістычнага пункту гледжання геаграфічныя найменні ўяўляюць сабой словы, якія трапілі на геаграфічную карту, адарваліся ад пэўных умоў і часу, што стварылі іх. Жывуць такія словы, выконваюць сваю службу і ўспрымаюцца як звычайныя, нягледзячы на тое, што ўзніклі яны ў розныя гістарычныя перыяды і захавалі ў сабе ў той ці іншай форме подых розных часоў. Вывучаюцца тапонімы, як і агульныя словы, лінгвістычнымі метадамі. Іх неабходна аналізаваць у прасторы і часе, гэта значыць, трэба рэканструяваць гістарычны фон, на якім адбывалася нараджэнне назвы, і ўсвядоміць асаблівасці самога геаграфічнага аб'екта. Без гэтых умоў самыя вытанчаныя спробы зразумець імя будуць дарэмнымі. Вось чаму, калі ніжэй ў асобных нарысах мы з дапамогай геаграфічных назваў будзем пракладваць сцежкі ў даўніну нашых палескіх гарадоў і вёсак, размова пойдзе не толькі пра ўласна тапонімы, але і пра разнастайныя гістарычныя падзеі. Такім чынам, гісторыя — у назвах, назва — у гісторыі.

У кожнага тапоніма свой лёс. І кожны з іх адлюстроўвае такую характэрную асаблівасць аб'екта, якая была найбольш выразнай, важкай, самай адметнай яго рысай у момант узнікнення назвы. А такой прыкметай, якая кідаецца ў вочы, можа быць пэўнай падзея, імены першых пасяленцаў ці ўладальнікаў вёскі, рамёствы жыхароў, а то і зусім выпадковае здарэнне. Кожнае новае пакаленне ўспрымае імёны сваёй мясцовасці па-рознаму, з уласцівым яму бачаннем свету. І можа здарыцца так, што імя, якое стала цьмяным, раптам адгукнецца нейкай здагадкай найбольш дапытліваму чалавеку, і тады народзіцца паданне ці легенда пра паходжанне назвы яго роднай мясцовасці.

Паданні, як і назвы, бываюць таксама рознымі — даўнімі, старажытнымі і новымі. І не ўсякае паданне — гэта абавязкова фантазія. У любой казцы есць доля ісціны, а самая фантастычная легенда заўсёды абапіраецца на канкрэтныя падзеі, рэальныя факты. Яшчэ старажытныя грэкі

гаварылі: каб зразумець рэч, трэба паглядзець на яе вачамі яе стваральнікаў. Бясспрэчна, цяжкая гэта справа, але ці можа быць інакш? У той галіне лінгвістычнай навукі, якая займаецца вывучэннем уласных імён, геаграфічных назваў, задача тым больш нялёгкая: каб высветліць паходжанне старажытных тапонімаў, трэба знайсці версію, якая б мела права на існаванне, зрабіць яе культурна-гістарычнае пацвярджанне. І ў гэтай справе нельга не звяртаць увагі на так званае народнае тлумачэнне геаграфічных назваў, бо яно і ёсць той самы позірк стваральніка імя.

У нашым падарожжы ў мінулае мы будзем абавязкова абапірацца на народныя паданні, аналізаваць легендарныя сюжэты, шукаць у іх адлюстраванне сапраўдных гістарычных падзей.

Калі чытача зацікавяць такія напрамкі нашага апавядання, ён абавязкова прачытае кнігу да канца. Яна складаецца з асобных раздзелаў, кожны з якіх мае сваю назву. Але ўсе раздзелы, хоць і ўяўляюць сабой самастойны расказ, аб'ядноўваюцца адзінай ідэяй і адзінай тэмай. Кніга, такім чынам, успрымаецца як "падарожжа" па Палессі ў прасторы і часе. Мы не ставім задачу прааналізаваць усе старажытныя назвы Палесся. Галоўнае для нас тое, каб чытач пасля знаёмства з кнігай звярнуў увагу на геаграфічныя імёны, зацікавіўся краязнаўчай тэматыкай. Магчыма, хто-небудзь успомніць паданні сваёй роднай мясцовасці, пажадае больш глыбока пазнаць мінулае свайго горада ці сваёй вёскі. Калі ўсё будзе менавіта так, аўтар будзе лічыць, што дасягнуў пастаўленай мэты*.

---

* На жаль, некаторыя з тых мясцін Гомельскага Палесся, якія вывучаў аўтар у пошуках легенд і паданняў пра вытокі геаграфічных найменняў, хутка, магчыма, назаўсёды абязлюдзеюць. Прычынай таму наша агульная бяда — Чарнобыльская трагедыя. Тым больш каштоўным здаецца нам матэрыял, сабраны аўтарам. — *Рэд.*



ПАЛЕССЕ І ПАЛЕШУКІ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ

Першае ўпамінанне Палесся адносіцца да 1274 г. у Іпацьеўскім летапісу і звязана з тэрыторыяй вакол сучаснага г. Капыля. Але ў далейшым пісьмовыя крыніцы XIV — XVII стст. і працы XVI — XIX стст. вельмі супярэчліва лакалізуюць геаграфічную назву *Палессе*. Яе размяшчаюць у розных частках даволі шырокага арэала — ад Падляшскага ваяводства і Берасцейскай зямлі да Валыні і Кіеўшчыны. Тлумачыцца такая нявызначанасць, на наш погляд, акрамя лінгвістычных і гістарычных прычын яшчэ і геаграфічнымі абставінамі. Справа ў тым, што Палессе — гэта не толькі пэўная гісторыка-этнаграфічная вобласць, але і тып ландшафту, які ўяўляе сабой пакрытыя лесам і моцна забалочаныя ў выніку празмернага атмасфернага ўвільгатнення нізіны. Палескі тып ландшафту характэрны не толькі для парэчча Прыпяці, але і для басейнаў Дняпра, Дзясны, для Мяшчэрскай нізіны ў басейне Акі, а таксама для ўсходніх раёнаў Польшчы. Мы лічым, што ўжо шмат стагоддзяў назад славянскі па ўтварэнню геаграфічны тэрмін *Палессе* выкарыстоўваўся ў мове носьбітаў славянскіх гаворак і як абагульненае найменне лясной і балоцістай тэрыторыі, і як уласная назва канкрэтнай мясцовасці з дакладнай лакалізацыяй тапоніма. На вялізнай тэрыторыі з палескім тыпам ландшафту існавала сваё разуменне *Палесся*. Дазваляюць зразумець гэта прыклады з сучасных палескіх гаворак. Напрыклад, на Тураўшчыне пад *Палессем* разумеюць толькі тую лясную і

балоцістую мясцовасць, якая размяшчаецца на поўдзень ад ракі Сцвігі. На нашу думку, і геаграфічную назву *Падляшша* (гістарычна — *Падляссе*) таксама трэба разумець як "зямлю пад лесам", г.зн. "пакрытую лесам". Часам сустракаецца і іншае тлумачэнне. Лічаць, напрыклад, што *Падляшша* — гэта літаральна "зямля пад ляхамі, паблізу Польшчы". Але пры такім тлумачэнні не ўлічваецца тое, што ў XVI ст., менавіта ў той час, калі звесткі аб Падляшшы пастаянна з'яўляюцца ў пісьмовых крыніцах, дадзеная геаграфічная назва перакладалася на лацінскую мову як subsilwānus — "зямля пад лесам".

Такім чынам, у многіх частках адзначанага вышэй арэала ўзнікненне тапонімаў тыпу *Палессе, Падляшша* магло адбывацца зусім незалежна і самастойна. Менавіта таму ў крыніцах XIII — XIX стст. няма адназначнага адказу на тое, дзе ж знаходзілася Палессе. Аднак прычынай гэтаму акрамя геаграфічных умоў былі і гістарычныя падзеі.

У трэцім томе "Живописной России", шматтомнай манументальнай гісторыка-геаграфічнай і этнаграфічнай працы рускіх вучоных канца XIX ст. мы сустракаем яшчэ адно цікавае разуменне *Палесся*. Аўтары даследавання апісваюць два Палессі: *Беларускае Палессе* (губерні Мінская, Магілёўская, Віцебская, Смаленская) і *Літоўскае Палессе* (губерні Гродзенская, Віленская, Ковенская). Калі з найменнем *Беларускае Палессе* ўсё больш-менш зразумела, то найменне *Літоўскае Палессе*, на першы погляд, даволі незразумелае і нечаканае. Калі паўднёвая частка былой Гродзенскай губерні сапраўды размяшчалася ў цяперашняй заходняй частцы Беларускага Палесся, то для тэрыторыі былых Віленскай і Ковенскай губерняў зусім не з'яўляўся характэрным палескі тып ландшафту. Аднак і простай аналогіяй геаграфічнаму паняццю *Беларускае Палессе* ўзнікненне назвы *Літоўскае Палессе* тлумачыць нельга.

На наш погляд, у апошнім геаграфічным абазначэнні ўскосна адлюстравалася старое найменне даволі загадкавай зямлі *Pollexia*, якое з'явілася ў пісьмовых крыніцах на рубяжы XII і XIII стст. Зямлю *Pollexia* насялялі *pollexiani*, ці палясяне, падлясяне. Жылі гэтыя плямёны прыкладна ў раёне сучаснага польскага горада Аўгустоў. Больш дакладна іх тэрыторыя вызначаецца наступнымі межамі: Мазурскія азёры на захадзе, левабярэжжа Нёмана на ўсходзе, парэчча Бебжы на поўдні і басейн ракі Шашупы на поўначы. Першыя звесткі пра гэтых *падлясян* (палясян) адносяцца да 1192 года. У польскіх хроніках расказваецца пра бітвы польскага караля Казіміра Справядлівага з *"гетамі"* і *"падлясянамі"*, або з *прусамі* і *яцвягамі*.

Тэрыторыя *яцвягаў-падлясян (палясян)* уваходзіла ў сферу інтарэсаў польскіх каралёў. З XIII ст. яцвягі, як і іншыя заходнебалтыйскія плямёны — прусы, борці, скалвы, вымушаны былі ратавацца ад знішчэння яшчэ і з боку крыжаносцаў. Частка яцвягаў-палясян перамяшчаецца на поўдзень, у прыватнасці, на параўнальна неабжытыя прасторы будучага Падлясся (Падляш-

ша). У склад Падляшша ўваходзілі землі Драгічынскага, Мельнікскага, Бельскага, Берасцейскага, Камянецкага і Кобрынскага паветаў. З XIV ст. зрэдку ў адносінах да названых зямель пачынаюць ужывацца геаграфічная назва *Падляшша* і этнічнае найменне *палясяне*, якое абазначала жыхароў Падляшша, у тым ліку і жыхароў сучасных заходніх раёнаў Беларускага Палесся. Цікава, што канчатковае ўсталяванне найменняў *Падляшша, палясяне* адносіцца да XVI ст., калі значна актывізавалася польскае засяленне Бельскага, Мельнікскага і суседніх паветаў. І гэта зразумела, бо этнічнае найменне *палясяне* справядліва лічыцца старапольскім найменнем яцвягаў. Этнаграфічныя матэрыялы XIX ст. (П. В. Баброўскі) адзначаюць сярод народнасцей Гродзенскай губерні *падлясян рускага* і *падлясян по́льскага* паходжання. Гэта былі славянскія этнаграфічныя групы, якія, аднак, сфарміраваліся на яцвяжскім субстраце. Аб гэтым сведчыць не толькі іх найменне, але і такая моўная асаблівасць, як замена гукаў *ж, ш, ч*, на *з, с, ц*, што характэрна для заходнебалтыйскіх гаворак. Захаваліся звесткі аб асобных групах яцвягаў паблізу Скідзеля, Навагрудка. Неабходна сказаць і аб тым, што на тэрыторыі былой Гродзенскай губерні зафіксавана 10 назваў пасяленняў тыпу *Ятвезь, Ятвязь, Ятвеск* (Гродзенскі, Ваўкавыскі, Свіслацкі, Дзятлаўскі, Карэліцкі, Івацэвіцкі, Баранавіцкі раёны). Што ж датычыць падлясян рускага і польскага паходжання, то для чытача, відаць, будзе цікавым іх апісанне. "Падлясяне рускага паходжання маюць твар круглы, смуглявы, нос прамы, вочы чорныя, зрэдку блакітныя, позірк хмурны, валасы цёмна-русыя; некаторыя носяць густыя бароды". "Падлясяне польскага паходжання (мазуры) — высокага росту, моцнага і правільнага целаскладу, вочы шэрыя і блакітныя, нос прамы, рэдка задзёрты, усе брыюць бароды і носяць вусы"*.

У 1978 г. на хутары ля пасёлка Новы Двор Пружанскага раёна на гары хаты старога дзеда-палешука быў знойдзены рукапіс, прыплецены да кнігі, выдадзенай у Варшаве ў XVIII ст. "Яцвяжскі слоўнік" — так назвалі вучоныя гэтую знаходку. У "Слоўніку" старанна запісаны словы яцвяжскай мовы. Зрабіў гэта нейкі цікаўны чалавек, якому зусім не абыякавай здавалася мова старажытнага народа, на якой размаўлялі, відаць, яе апошнія носьбіты.

Такім чынам, у XIV — XVI стст. у заходняй частцы сучаснага Беларускага Палесся выкарыстоўваўся этнонім *палясяне*. Ён быў даволі аўтаномным, раўнапраўным, напрыклад, з такімі этнічнымі найменнямі, як *літвіны, мазуране, валыняне*.

Што ж датычыць цэнтральнай і ўсходняй частак сучаснага Беларускага Палесся, то тут да канца XVI — пачатку XVII стст. для абазначэння спрадвечнага мясцовага славянскага насельніцтва выкарыстоўваўся агульны этнонім русіны (з варыяцыямі, у прыватнасці, чарнарусы), а таксама шэраг мясцовых (лакальных) найменняў тыпу тураўцы, рэчычане, піняне, ма-

---

* *Бобровский П. О.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 1. СПБ., 1863. С. 623,651.

зыране. З канца XIV і ў XV стст. тут пачаў ужывацца і этнонім літвіны, якім у наступныя стагоддзі карысталася ўкраінамоўнае і рускамоўнае насельніцтва для абазначэння беларусаў. У XVII ст. дакументы пачынаюць фіксаваць і найменне паляшук, якое ў далейшым, у XVIII — XIX стст., шырока распаўсюджваецца па ўсяму Палессю.

З'яўленне гэтага наймення трэба звязваць з украінамоўнымі перасяленцамі, якія з XVI ст. пранікалі на поўнач з Валыні, Падоліі, Палтаўшчыны, Кіеўшчыны, Чаркашчыны. *Валынцамі і чаркасамі* называлі гэтых перасяленцаў "маларускага племені". Ад гэтых найменняў на тэрыторыі Беларусі ў далейшым ўтварылася 16 назваў населеных пунктаў (гэта тапонімы тыпу *Валынцы, Чаркасы, Валынцішкі* ў Кармянскім, Верхнедзвінскім, Ашмянскім, Смаргонскім, Докшыцкім, Ліёзненскім і іншых раёнах). Ёсць на Беларусі і такія назвы, якія ўскосна ўказваюць на тых жа ўкраінскіх перасяленцаў: *Харкаў* (Хоцімскі раён), *Вінніца* (Навагрудскі раён), *Кіевец* (Валожынскі і Краснапольскі раёны), *Харкаўка* (Горацкі, Чавускі, Аршанскі раёны), *Галішчына* (Клімавіцкі раён) і іншыя.

Тыя ўкраінскія перасяленцы, якія асядалі на землях Палесся, часцей за ўсё называліся *палешукамі, пінчукамі* ці *бужанамі* (два апошніх найменні — больш у Заходнім Палессі). У сваю чаргу, палешукі-маларосы сваіх паўночных суседзяў звычайна называлі *літвінамі.*

Граніца паміж *палешукамі* і *літвінамі* (маюцца на ўвазе перш за ўсё менавіта назвы) праходзіла прыкладна ад Белавежскай пушчы праз Пружаны, Бярозу, далей па рэках Шчары і Бобрыку да Лунінца і Прыпяці, і па гэтай рацэ да яе ўпадзення ў Днепр. На поўдзень пераважна жылі *палешукі*, на поўнач — *літвіны — беларусы.*

Не трэба аднак прамалінейна разумець палешукоў як "чыстых маларосаў" — украінцаў. Палешукі — гэта вельмі неаднародная этнаграфічная група, якая складалася на працягу доўгага часу на даволі стракатай этнічнай аснове. Даследчык беларускай гісторыі У. І. Пічэта справядліва выдзяляў у Палессі так званы *паўднёвы этнічны дабеларускі цэнтр*, дзе ўзаемадзейнічалі патомкі *дрыгавічоў, драўлян, валынян-бужан і яцвягаў* (апошнія — у заходняй частцы арэала). У далейшым у Беларускім Палессі пачаў пераважаць беларускі этнічны кампанент, на Украінскім Палессі — украінскі. Але ж палітычныя межы ў нейкай ступені ўмоўныя, бо не заўсёды супадаюць з этнічнымі. Ва ўсякім разе, трэба лічыцца з тым, што ў паўднёвай частцы сучаснага Беларускага Палесся гістарычна пераважаў украінамоўны кампанент. Не выпадкова этнонім палешукі па сваёй структуры (суфікс — ук, параўн. пінчук, сяўрук) указвае на гэта. Больш таго, гэты этнонім не мог узнікнуць з нічога. Калі ў заходняй частцы Палесся этнічнае найменне палясяне, ці падлясяне прынеслі з сабой яцвягі, то найменне палешукі, хутчэй за ўсё, прыйшло на змену старажытнарускаму этноніму драўляне (дзераўляне). Іншымі словамі, найменне палешукі ("жыхары лесу") у мове ўкраінскіх перасяленцаў замяніла больш старое этнічнае абазначэнне драўляне, дзераўляне. Гэты

вывад робіцца на той падставе, што старажытнае зборнае слова "дерева" ("лес") папярэднічала слову "лес" у сучасным яго значэнні. Да такой жа думкі схіляюцца і ўкраінскія тапанімісты*.

Вось такой уяўляецца гісторыя геаграфічнай назвы *Палессе* і этнічных найменняў *палясяне, палешукі*. Як бачым, няма падстаў, каб лічыць палешукоў асобным народам, як нельга праводзіць занадта выразную граніцу паміж палешукамі-беларусамі і палешукамі-ўкраінцамі. Калі глядзець у гістарычнай рэтраспектыве на такі, здавалася б, зусім яшчэ нядаўна ізаляваны самой прыродай ад усяго іншага свету куток Зямлі, як Прыпяцкае Палессе, то і тут мы ўбачым, як узнікалі і фарміраваліся глыбокія карані роднасці народаў Усходняй Еўропы.

---

* Гідронімія Украіни в ії міжмовних і міждіалектних зв'язках. Київ, 1981. С. 90—92.

ЗАГАДКА ДРЫГАВІЧОЎ

Старажытнай летапіснай племянной групоўкай, якая насяляла землі Палесся, былі дрыгавічы. "Повесть временных лет" адводзіць дрыгавічам прастору паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной: "...седоша межю Припетью и Двиною и нарекошася дреговичи". Этнічнае імя дрыгавічоў традыцыйна разумеюць толькі як вытворнае ад слова "дрыгва". Гэтае тлумачэнне фармальна робіцца на той падставе, што Прыпяцкае Палессе, асноўная тэрыторыя племені, спрадвеку з'яўлялася сырой і балоцістай мясцовасцю. Аднак такая прастата разумення этнічнага імя, як гэта ні дзіўна, і прымушае сумнявацца ў яго правільнасці.

Першае, што адразу кідаецца ў вочы пры дэталёвым знаёмстве з тэрыторыяй дрыгавічоў, — гэта поўная адсутнасць геаграфічных найменняў, якія б адлюстроўвалі дадзены этнонім. Атрымліваецца дзіўная карціна: дрыгавічы быццам бы жылі на сваёй зямлі, аднак не пакінулі пасля сябе ніводнай назвы, якая б была напамінам аб іх. Праўда, зрэдку там-сям, асабліва ў папулярных гістарычных працах, можна прачытаць, што, напрыклад, назва *г. Драгічына* якраз і ўтварылася ад этнічнага наймення *дрыгавічы*. На самай справе, назва райцэнтра Брэсцкай вобласці *г. Драгічына* з'яўляецца так званым перанесеным тапонімам, гэта значыць, яе прынеслі з сабой перасяленцы, якія рухаліся з захаду дзесьці на заранку старажытнарускага часу. Гэтымі перасяленцамі былі заходнеславянскія плямёны, бо *г. Драгічын* існуе таксама і на тэрыторыі Польшчы. На карысць

такога тлумачэння гаворыць і паходжанне назвы гэтага горада ад мяркуемага ўласнага імя *Даргут*. На думку польскага даследчыка Я. С. Атрэмбскага, тапонім Драгічын трэба разумець як "мясцовасць, якая належыць нейкаму чалавеку па імені Даргут", пры гэтым корань адзначанага асабовага імя такі ж, як і ў польскіх імёнах *Драгамысл, Драгавіт* і нават у паўднёварускім *Дарагабыт* (ад апошняга ўтварылася назва горада *Драгобыча*). Значэнне ж нагаданых імёнаў адпавядае значэнню, напрыклад, прыметніка *дарагі*.

У апошні час беларускі даследчык М. І. Ермаловіч імкнуўся давесці, што з этнічным найменнем *дрыгавічы* звязаны такія геаграфічныя найменні, як *Драгуны* (вёска Міёрскага р-на), *Дрэгі, Дрэгелі* (былы Дзвінскі павет), *Дрыгучы* (в. Міёрскага р-на)*. Тапонім *Драгуны* ўтварыўся ад прозвішча *Драгун*, тапонімы *Дрэгі, Дрэгелі* — ад агульных слоў са значэннем "балота, багна, дрыгва" ці ад уласных імён і прозвішчаў *Дрэг (Дрэк), Дрэга (Дрэка)*. Назва *Дрыгучы* ўтварылася ад верагоднага прозвішча *Дрыгуч* ці ад тых жа *Дрэг, Дрэга*.

Ды і наогул, шукаць тапанімічныя "сляды" дрыгавічоў далёка ад граніц гэтага тэрытарыяльнага аб'яднання — марная справа.

Другой акалічнасцю, якая ставіць пад сумненне правільнасць тлумачэння этноніма *дрыгавічы* ад слова *дрыгва* з'яўляецца тое, што ён (этнонім) адзначаецца ў пісьмовых крыніцах і на іншых славянскіх землях, прычым у некалькі змененым гукавым выглядзе. Візантыйскія крыніцы XII ст. ведаюць *славян-драгувітаў*, ці *драгавітаў*, на Балканскім паўвостраве. Племя драговічаў мелася і сярод палабскіх славян. Супастаўленне найменняў надпрыпяцкіх дрыгавічоў са словам *дрыгва* па знешняму падабенству адбылося ўжо ў новы час, і, як мы лічым, было штучным. Сапраўдныя вытокі гэтага этнічнага імя губляюцца ў глыбіні стагоддзяў. Відаць, маюць рацыю тыя даследчыкі, якія лічаць, што ў склад дрыгавічоў, як і заходнеславянскіх драговічаў і паўднёваславянскіх драгувітаў (драгавітаў), увайшлі розныя адгалінаванні ад даволі старажытнага славянскага этнаплемяннога ўтварэння з блізкай па гучанню назвай, дакладныя першапачатковыя граніцы якога не зусім зразумелыя. Магчыма тэрыторыя гэтага аб'яднання знаходзілася дзесьці паблізу дунайскай прарадзімы славян, з якой разыходзіліся, як апавядае "Повесть временных лет", розныя славянскія плямёны. Гэты ж гісторыка-літаратурны помнік старажытнарускага часу ў сваёй недатаванай частцы ўспамінае сярод іншых усходнеславянскіх "княжэнняў" і палітычнае аб'яднанне дрыгавічоў. Летапісныя "плямёны" княжэнні ўзнікалі, як правіла, у працэсе кансалідацыі некалькіх асобных плямён. Дрыгавіцкая племянная групоўка не была выключэннем. А калі гэта так, дык неабходна вызначыць тыя часткі дрыгавіцкага этнапалітычнага аб'яднання, якія абумовілі яго ўзнікненне.

---

* *Ермаловіч М. І.* Старажытная Беларусь//Маладосць. 1988. № 7. С. 120.

Вядомы савецкі археолаг В.В.Сядоў, абапіраючыся на археалагічныя і антрапалагічныя матэрыялы, прыйшоў да думкі, што зямля дрыгавічоў дзялілася на дзве часткі. Дрыгавіцкае насельніцтва паўночнай паловы Прыпяцкага Палесся і бассейна Бярэзіны фарміравалася ў выніку асіміляцыі мясцовых балцкіх плямён. У паўднёвых раёнах тэрыторыі дрыгавічоў пераважала славянскае насельніцтва.

Усё гэта, верагодна, так і было, тым больш, што пацвярджаецца мясцовымі геаграфічнымі назвамі, перш за ўсё воднымі імёнамі, найменнямі рэчак басейна Прыпяці. Але для нас у дадзеным выпадку важна іншае. Мы павінны знайсці адказ на наступнае пытанне: калі, у выніку якіх падзей усталявалася этнічнае імя дрыгавічы; як дагэтуль называліся славянскія плямёны, што жылі на берагах Прыпяці. Адказ на гэтыя пытанні дапаможа вызначыць вытокі аднаго з буйнейшых племянных аб'яднанняў Старажытнай Беларусі.

Але пошукі адказу на пастаўленыя пытанні мы пачнем не з аналізу нейкіх гістарычных крыніц ці загадкавых геаграфічных назваў, а з... літаратурнага твора.

У беларускага паэта К.Каганца ёсць верш "Сцяты камень", напісаны па матывах старажытнага падання. Пачынаецца верш як звычайны рамантычны твор:

Засвітала раніца
После веснавое ночы,
Князь дулебаў, сам Кумар,
Працірае сосну вочы.
І, накінуўшы кажух,
У поле выйшаў падзівіцца,
Свежым ветрам веснавым
Сосну крыху асвяжыцца...

Раптам князь Кумар убачыў варожы след, кліча свайго баярына-ваяводу і мяркуе разам з ім, як перасцерагчы напад чужынцаў. Наступае кульмінацыйны момант, бо дулебы неўзабаве ўбачылі, "што падняў бой люты Гуд, сам наперад з агнём у воку". Як бачым, апісанне выгляду варожага князя Гуда не пазбаўлена фантастычных рысаў, што характэрна для паўлегендарных гістарычных апавяданняў, асабліва тых, якія датычацца старажытных плямён. Каб зберагчы свой люд, дулебскі князь Кумар выходзіць сам-на-сам на паядынак з Гудам.

У мечы тнуць,
Іскры б'юць...
Ой, заўзяты бой вядуць,
Князям рукі ўжо памлелі,
Сабе спуску не даюць,
Хоць з труду саўсім счарнелі.

У кожнага з князёў свае мэты (гэта вельмі важны момант для разумення агульнага зместу і сэнсу легенды).

Славы траціць Гуд не хоча,
З нічым да хаты ад'язджаць,
За другіх Кумар баіцца,
Каб іх у палон не аддаць.

Бой цягнецца вельмі доўга (!)

Чуць жывуць,
А ўсё тнуць...

Нарэшце, Гуд перамагае. Але здарылася нечаканае.

З заўзятасці абодвы
Зысці з места не маглі, —
Пазастылі бо князі
Як першы, так другі.
І Кумар
Ды і Гуд
Разам скамянелі.

З таго часу прайшло многа гадоў. А адбываліся гэтыя падзеі ў паўднёва-усходняй частцы Магілёўскай вобласці, на землях сучаснай Бабруйшчыны, у тых мясцінах, дзе

Ольса-рака, як тады,
І цяпер там працякае
Ды ў Бярозу, у раку,
Сіву воду заганяе...

У паданні, такім чынам, апавядаецца пра войны паміж *дулебамі* і *гудамі* (князь Гуд увасабляе адпаведныя племянныя групоўкі). Але ж, хто такія дулебы і гуды? *Дулебамі* называлі буйнейшую ўсходнеславянскую племянную групоўку, якая ў дакіеўскі перыяд займала прасторы ў вярхоўях Заходняга і Паўднёвага Буга, прыкладна ў раёне Валыні. У такім выпадку незразумела, як аказаліся дулебы на сярэднім цячэнні Бярэзіны.

Тут магчыма наступнае тлумачэнне. У сярэдзіне VI ст. дулебы падвергнуліся нападу з боку качавых плямён *аваряў*, ці *обраў*. Насілле, якое чынілі обры дулебам, было працяглым і нясцерпным. Вось што піша "Повесть временных лет": " ... обры "прымучылі" дулебаў і чынілі насілле жонам дулебскім: калі паедзе куды обрын, то не дазваляў запрагаць каня ці вала, а загадваў упрагаць у цялегу трох, чатырох ці пяцёрых жон дулебскіх і везці яго — обрына". Магчыма, частка дулебаў з Валыні ў пошуках паратунку і вымушана была перасяліцца на поўнач, у прыватнасці на сярэднюю Бярэзіну. Але чаму так далёка? Чаму дулебскія перасяленцы не аселі дзесьці на Палессі, на Прыпяці, дзе было значна больш незаселеных тэрыторый? Што ж датычыцца сярэдняй Бярэзіны, то археолагі лічаць, што на гэтых землях у VI ст. жылі балтыйскія плямёны, славяне ж з'явіліся пазней. Такім чынам, у VI — VII стст. пасяліцца тут перасяленцы-дулебы не маглі. Аднак, як гэта не дзіўна, якраз на сярэдняй Бярэзіне фіксуюцца цікавыя дулебскія "сляды" ў выглядзе геаграфічных назваў. Маюцца на ўвазе вёскі *Дулебы* (Бярэзінскі р-н) і *Дулебня* (Клічаўскі р-н). Як жа растлумачыць гэты факт?

Мы лічым, што адказ на пытанне крыецца не столькі ў самих назвах, колькі ў тэрытарыяльным іх размяшчэнні. Вескі *Дулебы* і *Дулебня* знаходзяцца на старажытнай паўночна-ўсходняй племянной граніцы дрыгавічоў, якая прыходзіла па водападзелу Друці і Бярэзіны і накіроўвалася далей на поўнач да ломанай

лініі, якую праводзяць умоўна паміж Оршай, Барысавам і Заслаўлем. Калі ж улічыць, што этнічныя геаграфічныя імёны ўзнікалі часцей за ўсё на паграніччы, то застаецца наступнае рашэнне: найменне *дулебы* было звязана не з кім іншым, як з дрыгавічамі. Назвы *Дулебы* і *Дулебня*, а таксама *Дулебка* (рака ў сістэме Бярэзіны-Дняпроўскай), з аднаго боку, з'яўляюцца цікавымі і ў нейкай ступені унікальнымі тапанімічнымі "слядамі" на старой племянной граніцы, якая падзяляла дрыгавічоў і крывічоў, а з другога боку, прымушаюць меркаваць, што пэўная частка дрыгавіцкага насельніцтва захоўвала найменне *дулебы* па меншай меры да канца X ст., бо менавіта да гэтага перыяду адносіцца нагаданая племянная граніца.

Да X—XIII стст. адносіцца асвойванне славянамі Верхняга Панямоння, і далёка не апошнюю ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі дрыгавічы. Перасяленцы-дрыгавічы, па ўсёй верагоднасці, неслі з сабой і старое этнічнае найменне — *дулебы* аб чым (зноў-такі толькі ўскосна) сведчаць дзве геаграфічныя назвы ў Гродзенскай вобласці — *Дуляўцы* (Ваўкавыскі р-н) і *Дуляўшчына* (Мастоўскі р-н).

Але чаму этнічнае найменне *дулебы* мела дачыненне менавіта да дрыгавічоў? Вось тут нам спатрэбяцца некаторыя археалагічныя факты. Вядома, што рассяленне дрыгавічоў у басейне Прыпяці ішло з поўдня. Адзін з вядучых савецкіх археолагаў В. В. Сядоў лічыць, што з былога племяннога саюзу дулебаў у выніку рассялення ў VIII — IX стст. вылучыліся асобныя тэрытарыяльныя групоўкі ўсходніх славян — у далейшым вядомыя як *валыняне, драўляне, паляне і дрыгавічы*. Ёсць падставы лічыць, што гэтаму рассяленню дало штуршок якраз нашэсце авараў, ці обраў. Але на тэрыторыю Беларусі з'явіліся ўжо не ўласна дулебы, а іх патомкі — новая групоўка — *дулебы-дрыгавічы*. Дарэчы, імя дулебскага князя Кумара з легенды вельмі нагадвае цюркскае па паходжанні імя. Дастаткова параўнаць яго, напрыклад, з сучасным нагайскім іменем *Кумараш*. Відаць, узаемадзеянне дулебаў з цюркскім качавым народам авараў знайшло адбітак у мове нашчадкаў валынскіх дулебаў. Нагадаем у гэтай сувязі цікавую геаграфічную назву на гістарычнай зямлі дрыгавічоў — *Камарын* (гарадскі пасёлак Брагінскага раёна).Камарын — гэта "горад *Камара (Кумара?)*". Аднак ёсць і іншае тлумачэнне. Аснова гэтага тапоніма — *Камар* — поўнасцю адпавядае слову *камар, кемер*, якое ў цюркскіх і іранскіх мовах народаў СССР азначае "схіл гары, пакат, уступ, бераг, абрыў, узгорак, гара". Такое тлумачэнне падходзіць для назвы Камарына, бо гарадскі пасёлак размешчаны на высокім беразе Дняпра. У іншым кутку Беларускага Палесся, на паўночным беразе Князь-возера (возера Чырвонае), ля вескі Рог, у 70-ых гадах XIX ст. мясцовыя сяляне, капаючы карчы на лучыну ў моцна забалочаным лесе Камароў Мох, знайшлі вялікую судзіну старажытных часоў. Яна была гружана соллю, адзін з сялян нават набраў гэтай солі. У іншы час там жа былі знойдзены тры лодкі звычайнай велічыні. Калі іх адкапалі і далі высахнуць, лодкі рассыпаліся ў парахню. Запісаныя расказы мясцовых старажылаў сведчаць, што ад Князь-возера

праз Камар-Мох у напрамку на паўночны захад да вёскі Даманавічы (цяпер — Салігорскі р-н) праходзіла шырокая рэчка ці вузкае возера. Вось адкуль тут старажытныя судны.

Лес Камароў Мох, ці Камар-Мох... ці не назва гэта той рэчкі, якая знікла? У гэтым цікавым тапоніме мы зноў бачым аснову *камар* — толькі ўжо ў некалькі іншым значэнні — "упадзіна, прамытая вадой у рацэ". Такое значэнне таксама ўласціва цюркска-іранскаму слову *камар, кемер*. Абедзве назвы — *Камарын і Камар-Мох* — узыходзяць да часоў дулебаў-дрыгавічоў.

Але вернемся да разгляду далейшага лёсу дулебаў. На рубяжы VIII — IX стст. паўночная граніца рассялення дулебаў-дрыгавічоў абмяжоўвалася лініяй, якая пачыналася прыблізна ў вусця Гарыні і праходзіла трохі на поўнач ад парэчча Прыпяці ў напрамку Дняпра. З пачатку IX ст. надпрыпяцкія плямёны пачынаюць актыўна прасоўвацца ў паўночным і паўночна-заходнім напрамку, паступова ўключаюць у свой склад і асімілююць мясцовае, пераважна балцкае і радзей славянскае насельніцтва. Хутка дулебы-дрыгавічы дасягаюць той граніцы, якую мы нагадалі вышэй. Такім чынам, дзесьці да IX ст. і адносяцца тыя драматычныя падзеі, аб якіх апавядаецца ў легендарным творы Каруся Каганца.

Але ж давайце прааналізуем гэты твор да канца. Дулебы-дрыгавічы, як падае нам легенда, падвяргаліся нападам з боку ваяўнічых гудаў. Рабунак, уводы ў палон, разарэнне і знішчэнне дулебскіх вёсак, як можна меркаваць, гуды чынілі рэгулярна. Нездарма князь Гуд "не хоча з нічым да хаты ад'язджаць", а князь Кумар "за другіх баіцца, каб іх у палон не аддаць". Заўвага ж наконт таго, што "бой цягнецца вельмі доўга", сведчыць аб працягласці нападаў гудаў. Дык, хто такія гуды?

Адказ дапамагаюць знайсці зноў-такі геаграфічныя назвы. На тэрыторыі Беларусі ёсць населеныя пункты Гуды (Валожынскі, Лідскі р-ны), Гудоўшчына (Маладзечанскі р-н), Гудаўшчына (Ашмянскі р-н), Гудзішкі (Шчучынскі, Іўеўскі р-ны), Гудава (Верхнядзвінскі р-н) і іншыя. Гэтыя вёскі знаходзяцца ў тых раёнах, дзе ў мінулым пражывалі значныя групы літоўскага насельніцтва. Геаграфічныя назвы тыпу Гуды, Гудава, Гудзішкі сустракаюцца ў паўночна-заходняй частцы Беларусі (Верхнядзвінскі р-н), амаль на ўсім працягу беларуска-літоўскага пагранічча (Пастаўскі р-н, былы Дзісненскі павет, Ашмянскі, Воранаўскі, Лідскі р-ны), а таксама ў Вілейскім, Маладзечанскім, Валожынскім, Стаўбцоўскім, Іўеўскім і Шчучынскім р-нах).

З даўніх пор *гудамі, гудаямі, гудасамі* называлі беларусаў літоўцы, прычым якраз тых беларусаў, якія пражывалі на беларуска-літоўскай граніцы. Аднак найменне гуды выкарыстоўвалася і для абазначэння пэўных літоўскіх груп з боку літоўцаў жа, а таксама палякаў, аднак не ўсіх літоўцаў і палякаў, а толькі тых, якія пражывалі на былой прускай этнічнай тэрыторыі (Калінінградская вобласць, паўночная частка мазавецкіх зямель Польшчы).

Сівая легенда, як бачым, дзіўным чынам данесла да нас водгалас падзей, аб якіх няма звестак у пісьмовых крыніцах. Яна

Гродненская городская библиотека имя А. Пушкина

апавядае нам аб войнах паміж славянскім насельніцтвам, якое прасунулася на сярэднюю Бярэзіну і займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбнай лоўляй, і ваяўнічымі плямёнамі, уладанні якіх пачыналіся паблізу сучаснай беларускалітоўскай граніцы і прасціраліся далей на захад і паўночны захад (сучасная Калінінградская вобласць і паўночная частка польскіх мазавецкіх зямель). *Гуды* — гэта не саманайменне, а абазначэнне, дадзенае з боку, якое выкарыстоўвалася суседзямі, напрыклад, тымі жа дулебамі. У кожнага з плямён аб'яднання гудаў было сваё ўласнае этнічнае імя. Што ж датычыць існавання адзінага этнічнага абазначэння *(гуды)* для насельніцтва адзначанага рэгіёна, то трэба заўважыць, што яно сваімі вытокамі ўсходзіць у яшчэ больш раннюю эпоху, у першыя стагоддзі новай эры, і звязана са знаходжаннем тут *готаў*, перайначанае імя якіх і адлюстравалася потым у найменні *гуды*. Тыя *гуды*, якія рабілі напады на сярэднебярэзінскіх дулебаў, у пачатку IX ст., відаць, уяўлялі сабой аб'яднанне, якое складалася на балцкай і славянскай асновах. У склад легендарных гудаў у адзначаны час уваходзіла і частка крывічоў. Можна меркаваць, што тымі гудамі, з якімі сутыкнуліся дулебы-дрыгавічы на водападзеле Друці і Бярэзіны, і былі менавіта крывічы.

Зразумела, усё, аб чым мы тут пішам, гэта толькі меркаванні. Ніякіх гістарычных крыніц аб тых далёкіх часах не захавалася.

Мы ўпамянулі аб сутыкненні крывічоў і дулебаў-дрыгавічоў на сярэдняй Бярэзіне. Аднак крывічы ў літаральным сэнсе цяснілі сваіх паўднёвых суседзяў і ў іншых месцах. На поўначы Гомельскай вобласці, у Курганскім сельсавеце Рагачоўскага раёна, існуюць дзве вёскі — *Стары Крыўск* і *Новы Крыўск*. Цэнтр сельсавета, у які ўваходзяць адзначаныя вёскі, называецца *Курганнем* зусім не выпадкова. Побач адкрыты цэлы археалагічны комплекс — 26 курганоў, якія датуюцца XI — XII стст. і дзе знаходзяцца радзіміцкія пахаванні. У наваколлі вёскі Новы Крыўск археолагі знайшлі яшчэ больш курганоў — 44 насыпы. У курганах пры раскопках даследчыкі адшукалі, на першы погляд, звычайныя ў помніках такога тыпу рэчы — кольцы, шкляны бісер, пацеркі, абломкі гліняпага посуду, жалезны нож, шыферныя прасніцы. Але вось што цікава і вельмі знамянальна: калі курганы X і пачатку XI ст. належалі радзімічам, то ў курганах XI і пачатку XII ст. з'яўляюцца рэчы, характэрныя толькі для крывічоў. Крывічы былі тут прышэльцамі.

Мясцовыя старажылы тлумачаць назву Крыўск ад вялікай дугі — крывізны, якая ўтварапася ад павароту шляху, што вёў у вёску. Невядома, калі з'явіўся тут гэты шлях, вядома толькі, што вытокі вёскі *Крыўск* трэба шукаць у старажытнарускі перыяд, а яе назву вельмі праўдападобна тлумачыць у сувязі з этнічным найменнем крывічоў.

Крывічы глыбока пранікалі на поўдзень і ў іншых раёнах Беларускага Палесся: вёскі пад назвай *Крывічы* існуюць у Салігорскім раёне Міншчыны і Пінскім раёне Брэсцкай вобласці. Апошняя вёска — сапраўды "рэліктавая" кропка на карце. Размешчана яна на левым беразе Прыпяці, на высокім месцы,

якое акружана з усіх бакоў балотамі. Таму і сувязі з вёскай ажыццяўляюцца толькі праз Прыпяць на лодках. Можна толькі ўявіць, што было тут 300, 500 гадоў назад! На жаль, цяпер з кожным годам колькасць хат у вёсцы змяншаецца, людзі перасяляюцца ў іншыя месцы, і ўсяго ў Крывічах на сённяшні дзень жыве каля 60 чалавек і захавалася 38 двароў.

Аднак вернемся зноў да дрыгавічоў-дулебаў, бо наш расказ пра іх яшчэ далёка не завершаны. Аб тым, што дрыгавічоў, прынамсі ў IX — пачатку X ст., называлі дулебамі, сведчаць не толькі легенда, расказаная К.Каганцом, і геаграфічныя назвы *Дулебы* і *Дулебня* Бярэзінскага і Клічаўскага раёнаў. Гэта недвухсэнсава зафіксавана і ў "Повести временных лет". У 907 г. кіеўскі князь Алег пайшоў паходам на грэкаў "і ўзяў з сабой мноства варагаў, і славен, і чудзь, і крывічоў, і меру, і драўлян, і радзімічаў, і палян, і севяран, і вяцічаў, і харватаў, і дулебаў, і цівercаў..." Як бачым, у вялікі паход паднялася ўся падуладная ў той час Кіеву Русь. *Дулебамі*, якія прынялі ўдзел у паходзе, былі менавіта дрыгавічы. Імі не маглі быць першапачатковыя дулебы, якія ў VI ст. жылі на Валыні, бо ў пачатку X ст. яны ўжо не існавалі, а на іх былых землях пражывалі *бужане* і *валыняне*. Пад найменнем *дулебы* ў летапісным паведамленні маглі разумецца разам з дрыгавічамі таксама гэтыя народы. Такім чынам, мы яшчэ раз упэўніліся ў тым, што этнічным саманайменнем дрыгавічоў было імя *дулебы*. Гэтае імя існавала, згодна з летапісамі, да пачатку X ст., таму ўдзел дулебаў у паходзе князя Алега з'яўляецца амаль ці не апошнім упамінаннем гэтага этноніма.

Цяпер мы павінны адказаць на пытанне аб тым, калі, пры якіх абставінах за асноўнай славянскай племянной групоўкай паўднёвай Беларусі замацавалася яшчэ адно найменне, менавіта тое, пад якім гэтая групоўка ўвайшла ў гісторыю. Размова ідзе пра этнонім *дрыгавічы*. Тое, што гэтае імя мае несумненную паралель з заходнеславянскай племянной назвай *драговічы*, выпадковасцю лічыць нельга. Пісьмовыя крыніцы канца VIII ст. (789 г.) называюць імя князя *Драгавіта*, які "значнасцю рода і аўтарытэтам старшынства намнога ўзвышаўся над астатнімі старшынамі вялетаў". Племянное аб'яднанне *вялетаў*, ці *люцічаў*, існавала ў той час на ніжнім Одэры. У помніках вялеты характарызуюцца як "слаўныя храбрасцю", бо на іх долю выпала найбольшае супраціўленне нямецкаму наступленню на славянскія землі ў VIII ст. Не ведаем, як у плане гістарычным, але ў лінгвістычных адносінах этнонімы *драгавіты (драгувіты)*, *дрыгавічы*, *драговічы*, несумненна, суадносяцца з імем князя вялетаў *Драгавітам*. Гэтая адпаведнасць, аднак, не павінна служыць падставай для таго, каб лічыць дадзеныя этнічныя імёны вытворнымі ад імя князя. Хутчэй за ўсё сам Драгавіт насіў імя, якое ўтварылася ад этноніма. Успомнім у гэтай сувязі легендарнага князя Гуда, у імені якога ўвасоблена абагульненае абазначэнне шэрагу плямён. Аднак у дадзеным выпадку галоўнае зусім не гэта.

Гісторыя вялетаў, як і гісторыя іншых палабска-прыбалтыйскіх (паморскіх) славян, дае нямала прыкладаў трагічнага

гераізму і бязлітаснай, адчаяннай барацьбы за сваю незалежнасць. Пад націскам захопнікаў асобныя плямёны паморскіх славян перамяшчаліся на ўсход, у тым ліку і на тэрыторыю сучаснай Беларусі. Яны ратаваліся ад знішчэння, шукалі новыя месцы для сталага жыхарства сярод неабжытых прастораў Панямоння, Прыдзвіння, Падняпроўя і нават Палесся. "Сляды" паморскіх перасяленцаў, як дарэчы і іншых заходнеславянскіх (ляхіцкіх) плямён, знаходзяць і на Украіне. Украінскія даследчыкі зрабілі для гэтага пэўныя намаганні. Яны, напрыклад, супастаўляюць тапанімію тэрыторый старажытнарускіх плямён *палян і драўлян* і аднанайменных заходнеславянскіх плямён *(паляне, драване)*. У беларускай гістарыяграфіі такіх даследаванняў няма. Таму мы спынімся на некалькіх уласных меркаваннях.

На Тураўшчыне запісана некалькі варыянтаў падання аб прыходзе на Палессе князя Тура з вялікім войскам. Гэты факт ускосна пацвярджае і "Повесть временных лет", якая падкрэслівае "заморскае" паходжанне першага легендарнага тураўскага князя. Падрабязны аналіз гэтых паведамленняў робіцца намі ніжэй ў спецыяльнай главе. Тут жа скажам толькі, што як летапіс, так і легенда адзначаюць, на наш погляд, рэальныя падзеі, а менавіта перасяленне часткі паморскіх, палабска-балтыйскіх ці іншых заходнеславянскіх плямён на тэрыторыю дулебаў-дрыгавічоў. Такія перасяленні ў пэўных выпадках маглі адыгравaць кансалідуючую ролю і ствараць умовы для ўзнікнення палітычных цэнтраў-княжэнняў. Нездарма легендарны князь Тур лічыцца стваральнікам моцнага княжацкага цэнтра ў Тураве — сталіцы надпрыпяцкіх дрыгавічоў. Мы мяркуем, што перамяшчэнні частак заходнеславянскіх плямён на тэрыторыю Беларусі пачаліся ў IX ст. З гэтымі падзеямі звязана ўзнікненне летапісных паданняў не толькі аб князю Туру, але і аб прыходзе ў Полацк "з-за мора" князя Рагвалода, а таксама аб "ляшскім" паходжанні радзімічаў, а яшчэ і аб з'яўленні на Русі легендарнага Рурыка з братамі Сінявусам і Труварам і "радамі сваімі".

У сувязі з мяркуемымі паморска (і больш шырока — заходнеславянска — палескімі, або беларускімі) этнічнымі сувязямі выклікае цікавасць яшчэ шэраг тапонімаў Беларускага Палесся і іншых раёнаў Беларусі. Так, адзначым гукавое падабенства з заходнеславянским этнонімам *ленчычане* геаграфічнай назвы *Лельчыцы (Ленчыцы)* (падрабязна аб гэтай назве гл. у раздзеле Лельчыцы — Ленчыцы). Этнонім сербскай групы заходніх славян *лупагалоўцы* мог адлюстравацца ў назве вёсак *Новыя / Старыя Галоўчыцы* Петрыкаўскага р-на і *Галоўчыцы* Нараўлянскага р-на, а таксама ў назве ракі *Лупагалова (Луппа)*, прытоку *Мярэі* (Магілёўшчына). Вёскі тыпу *Галоўчыцы* маюцца і ў іншых месцах Беларусі — у Драгічынскім, Пружанскім, Камянецкім, Расонскім, Чэрыкаўскім раёнах, і да іх гісторыі трэба ўважліва прыгледзецца гісторыкам і мясцовым краязнаўцам. У назве вёскі Лельчыцкага раёна — *Ліпляны* вельмі верагодна шукаць адлюстраванне наймення заходнеславянскага племя *ліп'ян (ліпян)* (аб'яднанне *вялетаў-люцічаў*).

Нагадаем яшчэ некалькі верагодных паралеляў: этнонім *люцічы (вялеты)* — тапонім *Лучыцы* (вёскі Петрыкаўскага і Асіповіцкага р-наў); *Лютовічы, Лютавічы* (вёска Капыльскага р-на); паморскі этнонім *гліняне* — тапонім *Гліняны* (вёска Гродзенскага р-на), *Глінічы* (вёска Шчучынскага р-на); этнонім *семчыцы* — тапонім *Сенчыцы* (вёска Драгічынскага р-на); этнонім *нудзічы* (сербская група заходнеславянскіх плямён) — тапонім *Нудзічы* (вёска Брагінскага р-на); паморскі этнонім *вагры* — тапонімы *Багрымавічы* (вёска Петрыкаўскага р-на), *Вагараўшчына* (вёска Ліозненскага р-на); этнонім *сербы* — тапонімы *Сербіна* (вёска Вілейскага р-на), *Сербінішкі* (вёска Воранаўскага р-на); этнонім *ліп'яне (ліпяне)* — тапонімы *Ліпляні* (вёска Глыбокскага р-на), *Ліпяні* (вёска Мінскага р-на), *Ліплянск* (вёска Сенненскага р-на); этнонім *серадзяне* (ляхіцкая група плямён) — тапонімы *Серадзіна* (вёска Докшыцкага р-на), *Сеорадзін* (вёска Пухавіцкага р-на); этнонім *памаране* — тапонімы *Памараўшчына* (вёска Мядзельскага р-на), *Паморшчына* (вёска Валожынскага р-на); этнонім *кашубы* (усходняя частка польскага Памор'я) — тапонім *Кашубінцы* (вёска Гродзенскага р-на); этнонім *вялеты* — тапонім *Вялетава* (вёска Карэліцкага р-на); этнонім *рачане* (саюз вялетаў-люцічаў) — тапонім *Рачаны* (вёска Пастаўскага р-на); этнонім *калездічы* (сербская група) — тапонімы *Калядзічы* (вёска Ваўкавыскага р-на, вёскі Пружанскага і Пінскага р-наў), *Калацічы* (вёска Глускага р-на); этнонім *мільчане, мільцы* (сербская група) — тапонім *Мільцэі* (вёска Астравецкага р-на).

Зразумела, што не ўсе нагаданыя паралелі з'яўляюцца ў аднолькавай ступені пераканаўчымі. Некаторыя з іх даволі спрэчныя. Аднак ужо сам факт іх існавання ў вялікай колькасці прымушае звярнуць пільную ўвагу на гэты, даволі нечаканы напрамак далейшых даследаванняў. Верагодныя "сляды" шэрагу заходнеславянскіх плямен на тэрыторыі Беларусі не азначаюць, што многія з адзначаных вёсак былі заснаваны менавіта перасяленцамі. Такі прымітыўны, фармальны падыход быў бы памылковым. У большасці выпадкаў сувязь паміж этнічнымі і геаграфічнымі назвамі з'яўляецца апасродкаванай, у прыватнасці ўласнымі імёнамі ці групавымі прозвішчамі, мянушкамі ўласна беларускага насельніцтва тых ці іншых вёсак. Аднак і ўласныя імёны і групавыя мянушкі, якія звычайна існуюць многія стагоддзі і перадаюцца з пакалення ў пакаленне, утварыліся ад старых этнонімаў. У гэтым і заключаецца сутнасць "слядоў" таго ці іншага народа ў тапаніміцы.

Цікава адзначыць вось яшчэ што. З нагаданых вышэй тапонімаў прыкладна 17 назваў размяшчаюцца на старажытнай тэрыторыі дрыгавічоў, 11 назваў — у межах былой Полацкай зямлі. Яшчэ 5 — 6 тапонімаў знаходзяцца паблізу этнічнага пагранічча крывічаў і дрыгавічоў. Этнічныя, палітычныя, гаспадарчыя сувязі Полацкага княства з Польшчай, скандынаўскімі і нямецкімі землямі добра вядомыя. Цяпер мы можам сцвярджаць, што і Дрыгавіцкая зямля не ўступала палачанам ў гэтым плане.

Важнасць адзначаных паралелей тым большая, што яны недвухсэнсава сведчаць аб найбольш старажытных сувязях заходнеславянскіх зямель і Палесся. Дарэчы, на гэтыя сувязі ўказваюць і іншыя, больш вядомыя ў літаратуры тапанімічныя факты. Маюцца на ўвазе геаграфічныя назвы, утвораныя ад этнічных найменняў *ляхі і мазуры*. Такія назвы сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі, і іх даволі многа. Напрыклад, толькі ад этноніма *ляхі* ўтворана 20 геаграфічных назваў, якія служаць найменнямі 73 населеных пунктаў Беларусі. Падобным тапонімам на тэрыторыі Палесся прысвечаны асобныя раздзелы гэтай кнігі (гл. "Ля вытокаў назвы Мазыр" і "Слянзакі-сілезцы Петрыкаўскага раёна").

Такім чынам, прыведзеныя факты даюць падставы сцвярджаць, што найменне *дрыгавічы* замацавалася ў паўднёвым арэале славянскіх плямён, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, значна пазней этноніма *дулебы*, выступаўшага ў якасці саманайменння старажытных жыхароў Палесся. Новая назва — *дрыгавічы* — мела не столькі этнічны, колькі этна-палітычны характар, паколькі яе паступовае замацаванне адбывалася ў час дрыгавіцкага княжэння. У палітычны саюз дрыгавічоў увайшлі мясцовыя ўсходнеславянскія (дулебскія) і балцкія плямёны, а таксама групы заходнеславянскага насельніцтва (галоўным чынам, паморскія і палабскія славяне). Апошнія і прычыніліся да ўзнікнення ўсходнеславянскага этноніма дрыгавічы.